Ба 41110

ДЗЯРЖАЎНАЯ БІБЛІЯТЭКА БССР ІМЯ В. І. ЛЕНІНА

# ПЯТРУСЬ БРОЎКА

БССР ДЗЯРЖ... ІМЯ ЛЕНІНА

ДЗЯРЖАЎНАЕ
ВУЧЭБНА-ПЕДАГАГІЧНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
МІНСК 1954

Ба 41110

ДЗЯРЖАЎНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ В. І. ЛЕНІНА

АДДЗЕЛ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І БІБЛІЯГРАФІІ

*Пісьменнікі БССР*
Серыя памятак чытача

# ПЯТРУСЬ БРОЎКА

Бібліяграфічная памятка чытача

Дзяржаўная бібліятэка БССР імені Леніна

Бел. адд. 1954 г.

МІНСК 1954

Склала *Н. Ватацы*
Рэдактар *Р. Казуной*
Тэхрэдактар *П. Сцержанай*
Карэктар *Я. Плесанава*

Падпісана ў набор 18/VIII-1954 г. Падпісана да друку 25/IX-1954 г. АТ 04178. Тыраж 2000 экз. Папера 70×108¹/₃₂. Аўт. арк. 0,51. Вуч.-выд. арк. 0,53. Пап. арк. 0,312. Друк. арк. 0,856. Цана 25 кап.
Зак. 584.

Друкарня імя Сталіна, Мінск, праспект імя Сталіна, 105.

Серыя бібліяграфічных памятак «Пісьменнікі БССР» разлічана на шырокія колы чытачоў і на бібліятэкараў масавых бібліятэк. Памяткі ставяць сваёю мэтай дапамагчы бібліятэкарам у іх даведачна-бібліяграфічнай рабоце, звязанай з прапагандай твораў беларускіх пісьменнікаў.

Памятка, прысвечаная двойчы лаўрэату Сталінскай прэміі Петрусю Броўку, змяшчае тэкст пастаноў Совета Міністраў СССР аб прысуджэнні яму прэмій, асноўныя даты жыцця і творчасці паэта, спіс найбольш новых выданняў яго твораў, спіс твораў П. Броўкі, выданых за апошнія гады на рускай мове і кароткі спіс крытычных артыкулаў аб творчасці П. Броўкі.

2 — 584



# ПЯТРУСЬ БРОЎКА

## АБ ПРЫСУДЖЭННІ СТАЛІНСКІХ ПРЭМІЙ ЗА ВЫДАТНЫЯ РАБОТЫ Ў ГАЛІНЕ МАСТАЦТВА І ЛІТАРАТУРЫ ЗА 1946 г.

*ПАСТАНОВА СОВЕТА МІНІСТРАЎ СССР*

Совет Міністраў Саюза ССР пастанаўляе:

Прысудзіць Сталінскія прэміі за выдатныя работы 1946 года ў галіне:

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

К. Паэзіі

Прэміі другой ступені ў размеры 50 000 рублёў.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

**2. БРОЎКУ Пятру Усцінавічу**—за паэмы «Хлеб» і «Думы пра Маскву», вершы: «Брат і сястра», «Народнае дзякуй», «Каб мне быць», «Спатканне».

Газ. «Правда» за 7/VI-1947 г.

* * *

## АБ ПРЫСУДЖЭННІ СТАЛІНСКІХ ПРЭМІЙ ЗА ВЫДАТНЫЯ РАБОТЫ Ў ГАЛІНЕ НАВУКІ, ВЫНАХОДСТВА, ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА ЗА 1950 г.

### *ПАСТАНОВА СОВЕТА МІНІСТРАЎ СССР*

Совет Міністраў Саюза ССР пастанавіў прысудзіць Сталінскія прэміі за выдатныя навуковыя працы, вынаходства і карэнныя ўдасканаленні метадаў вытворчай працы і за выдатныя творы ў галіне літаратуры і мастацтва за 1950 год.

3. Сталінскія прэміі за выдатныя работы ў галіне літаратуры і мастацтва:

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

**Б. Паэзіі**

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Прэміі трэцяй ступені ў размеры 25 000 рублёў:

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

**2. БРОЎКУ Пятру Усцінавічу** — за зборнік вершаў «Дарога жыцця».

Газ. «Правда» за 17/III-1951 г.

Мая айчына —
Поле, нівы,
Над Нёманам зялёны гай,
Прыгожы Брэст і Мінск шумлівы —
Уся Беларусь ад краю ў край.
Люблю яе бары, азёры...
Ды, як-бы іх не шанаваў,
Калі-б не знаў другіх прастораў, —
Напэўна-б я засумаваў.

Я палюбіў навечна,
Шчыра
Алтай, Палтаўшчыну і Крым...
Ад Ленінграда да Паміра,
Радзіма, ў сэрцы ты маім!

*Пятрусь Броўка* [1])

---

[1]) П. Броўка. Выбраныя творы. Мінск, ДВБ, 1951, стар. 502.

«Мая дарагая Радзіма,
Шчаслівыя мы з табой!»

*Пятрусь Броўка* [1])

## АСНОЎНЫЯ ДАТЫ ЖЫЦЦЯ І ТВОРЧАСЦІ П. БРОЎКІ

1905 25 чэрвеня 1905 г. у вёсцы Пуцілкавічы, Ушацкага р-на, Віцебскай вобласці, у сям'і селяніна-бедняка нарадзіўся Пётр Усцінавіч Броўка— Пятрусь Броўка.

1918 Скончыўшы трэці клас Лепельскага вышэйшага пачатковага вучылішча, Пятрусь Броўка, трынаццацігадовым хлопчыкам пачаў жыць самастойна. У 1918 г. паступае перапісчыкам у Вяліка-Долецкі валасны ваенны камісарыят, некаторы час працуе справаводам у Вяліка-Долецкім валіспалкоме.

1919 У час белапольскай акупацыі жыў і працаваў у бацькі на гаспадарцы.

1920—1922 Пятрусь Броўка працуе спачатку ў канторы страхавога агенцтва, пасля рахункаводам у соўгасе.

1923 Пятрусь Броўка ўступае ў комсамол, узначальвае комсамольскую ячэйку ў Мала-Долецкім сельсовеце.

---

[1]) П. Броўка. Выбраныя творы. Мінск, ДВБ, 1951, стар. 662.

1924 19-цігадовым хлопцам Пятрусь Броўка выбіраецца старшынёй Мала-Долецкага сельсовета.

1925 Полацкі акружком ЛКСМБ адклікае Петруся Броўку ў г. Полацк на комсамольскую работу. П. Броўка працуе ў Полацкім акруговым камітэце ЛКСМБ. Увесь час настойліва працуе над папаўненнем сваіх ведаў.

1926 18 жніўня 1926 г. у акруговай газеце «Чырвоная Полаччына» публікуецца першы верш Петруся Броўкі «Ой, не шапчы, мая бярозка».

1927—28 Пятрусь Броўка працуе сакратаром акруговай газеты «Чырвоная Полаччына».

1928 Пісьменнік пастурае на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

1930 Выходзіць першая кніга вершаў паэта **«Гады як шторм»** (Мінск, ДВБ, 1930), у якую ўвайшлі яго вершы 1928—1930 гг. аб соцыялістычнай перабудове нашай краіны; выдаецца паэма, напісаная да 10-годдзя з дня вызвалення Беларусі ад белапалякаў, **«Прамова фактамі»** (Мінск, ДВБ, 1930).

Увосень 1930 г. напісаны паэма **«Цэхавыя будні»** і аповесць **«Каландры»**, прысвечаныя ўдарнікам Добрушскай папяровай фабрыкі **«Герой працы»**.

1931 Пятрусь Броўка скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт.

Асобным выданнем выходзіць аповесць **«Каландры»** (Мінск, ДВБ, 1931).

1932 Пятрусь Броўка піша паэму **«Праз горы і стэп»** аб дзейнасці 7-й Самарскай дывізіі.

Вышла кніга Петруся Броўкі «Паэзія» (Мінск, ДВБ, 1932).

1933 Выдаецца кніга нарысаў, напісаных разам з паэтам Пятром Глебкам, **«Ураджай»** (Мінск, ДВБ, 1933).

Другім выданнем выходзіць аповесць «Каландры» (Мінск, ДВБ, «Школьная серыя», 1933).

1934 Асобным выданнем вышла паэма Петруся Броўкі «**Так пачыналася маладосць**» (Мінск, ДВБ, 1934).

1935 Выдаецца зборнік вершаў паэта **«Прыход героя»** (Мінск, ДВБ, 1935).

Выходзіць у Маскве першая кніга вершаў Петруся Броўкі ў перакладзе на рускую мову. (**«Избранные стихи»**. Перевод с белорусского. М., ГИХЛ, 1935).

1937 Выдаецца зборнік вершаў і паэм Петруся Броўкі **«Вясна радзімы»** (Мінск, ДВБ, 1937).

1938 Напісана і выдана вядомая паэма Петруся Броўкі «**Кацярына**» (Мінск, ДВБ, 1938). Яна прысвечана гістарычнаму шляху беларускага народа і барацьбе яго за перамогу калгаснага ладу.

1939 За выдатныя поспехі і дасягненні ў развіцці мастацкай літаратуры Пётр Усцінавіч Броўка ўзнагароджан ордэнам Знак пачота. [1])

1940 Пятрусь Броўка ўступае ў рады ВКП(б).

Выдаюцца кнігі паэта: зборнік вершаў «**Шляхамі баравымі**» (Мінск, ДВБ, 1940) і зборнік выбраных вершаў «Вершы і паэмы» (Мінск, ДВБ, 1940).

1941 Пятрусь Броўка знаходзіцца ў радах Чырвонай Арміі, працуе ў франтавой газеце «За Савецкую Беларусь».

1942 Пятрусь Броўка піша гераічную **«Паэму аб Смалячкове»**. У канцы 1942 г. Пётр Усцінавіч

---

[1]) Газ. «Правда» за 1/II-1939 г.

быў адклікан у распараджэнне ЦК КП(б)Б, працаваў па заданню Цэнтральнага Камітэта ў партызанскім друку.

1943 Паэтам напісана гераічная паэма аб беларускім народзе **«Беларусь».**

Выходзіць зборнік вершаў Петруся Броўкі **«Насустрач Сонцу»** (М., выд. ЦК КП(б)Б «Савецкая Беларусь», 1943), які змяшчае ў сабе вершы 1941 — 1943 гадоў; у Маскве выдан зборнік вершаў паэта ў перакладзе на рускую мову **«К родным берегам».** (М., Гослитиздат, 1943).

1944 Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 1 студзеня 1944 г. Пётр Усцінавіч Броўка за заслугі перад Радзімай у часе Вялікай Айчыннай вайны ўзнагароджан ордэнам Чырвонай Звязды. [1])

Пётр Усцінавіч варочаецца ў родны Мінск, вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Піша лірыка-эпічную паэму **«Ясны кут»** аб адраджэнні жыцця на руінах і папялішчах, пакінутых беларускаму народу акупантамі.

1945 Напісана паэма **«Паланянка»** аб дзяўчатах, загнаных на фашысцкую катаргу ў час Вялікай Айчыннай вайны.

Выдан зборнік яго вершаў **«Выбраныя творы»** (Мінск, ДВБ, 1945); на рускай мове выходзіць зборнік вершаў «Беларусь» (М., «Сов. писатель», 1945).

Пётр Усцінавіч прызначан галоўным рэдактарам часопіса «Полымя» (1945 — 1948).

1946 Пятрусь Броўка піша вядомую паэму **«Хлеб»** аб мірнай творчай працы савецкага чалавека, нядаўняга воіна.

Выдаецца кніга вершаў паэта **«У роднай хаце»**

---

[1]) Гл. газ. «Совецкая Беларусь» за 14/I-1944 г.

(Мінск, ДВБ, 1946); у серыі «Школьная бібліятэка» — зборнік выбраных твораў **«Вершы і паэмы»** (Мінск, ДВБ, 1946).

1947 9 лютага 1947 г. Пётр Усцінавіч Броўка выбран дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР. [1])

У чэрвені 1947 г. Пятрусь Броўка ўдастоен Сталінскай прэміі другой ступені за паэмы «Хлеб» (1946) і «Думы пра Маскву» (1946), а таксама вершы: «Брат і сястра» (1946), «Народнае дзякуй» (1946), «Каб мне быць» (1946), «Спатканне» (1943). [2])

Пятрусь Броўка піша паэму **«Бацькаў дом»**.

У кастрычніцкай серыі «Выбраных твораў беларускай совецкай літаратуры 1917 — 1947» выдана кніга паэта **«Выбраныя творы»** (Мінск, ДВБ, 1947); у перакладзе на рускую мову выданы кнігі вершаў **«Думы о Москве»** (М.-Л., ГИЗ 1947) і **«Стихи»** (М., «Правда», серыя «Огонек» № 37, 1947).

1948 З 1948 г. Пётр Усцінавіч Броўка старшыня праўлення Саюза Совецкіх пісьменнікаў БССР.

У гэтым годзе заканчвае пісьменнік паэму **«Родныя берагі»**, у якой малюе творчы ўздым калгаснага сялянства і ўдзячную працу совецкага агранома.

У серыі «Б-ка школьніка» выдана кніга выбраных твораў П. Броўкі **«Выбраныя вершы і паэмы»** (Мінск, ДВБ, 1948). У серыі «Б-ка избранных произведений советской литературы 1917 — 1947» выдана кніга Петруся Броўкі **«Стихи и поэмы»** (М., «Советский писатель», 1948).

---

[1]) Гл. газ. «Звязда» № 33 за 13/II-1947 г.

[2]) Гл. газ. «Звязда» за 7/VI-1947.

1949 Да 30-годдзя Беларускай ССР (1 студзеня 1949 г.) Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 30 снежня 1948 г. Пётр Усцінавіч Броўка ўзнагароджан ордэнам Леніна. [1])

На XIX з'ездзе Комуністычнай партыі Беларусі ў 1949 г. Пётр Усцінавіч быў выбран кандыдатам у члены ЦК КПБ. [2])

Пятрусь Броўка піша паэму **«Добры друг»** аб самаадданай працы маладога вясковага совецкага ўрача, аб сучаснай калгаснай вёсцы.

У Маскве выходзіць кніга вершаў паэта ў перакладзе на рускую мову «**Избранное**» (М., ГИЗ, 1949).

1950 Пятрусь Броўка піша паэму **«Чырвон-гарадок»** аб сучаснай калгаснай вёсцы Заходняй Беларусі, аб карэнных зменах у жыцці і маральным вобліку насельніцтва Заходніх абласцей Беларусі.

Выходзіць кніга вершаў і паэм П. Броўкі **«Сонечнымі днямі»** (Мінск, ДВБ, 1950). У перакладзе на рускую мову выдаецца новая кніга вершаў паэта **«Дорога жизни»**. (Минск, ГИЗ БССР, 1950).

1951 25 лютага 1951 г. Пётр Усцінавіч Броўка другі раз выбран дэпутатам Вярхоўнага Совета Беларускай ССР. [3])

У сакавіку 1951 г. Петрусю Броўку прысуджана Сталінская прэмія трэцяй ступені за зборнік вершаў «Дарога жыцця». [4])

---

[1]) Гл. газ. «Звязда» за 1/I-1949 г.

[2]) Гл. газ. «Звязда» за 19/II-1949 г.

[3]) Гл. газ. «Звязда» за 28/II-1951 г.

[4]) Гл. газ. «Правда» за 17/III-1951 г.

Выдана кніга паэта **«Выбраныя творы»** (Мінск, ДВБ, 1951). У перакладзе на рускую мову выдана кніга **«Стихотворения и поэмы»** (М., ГИЗ, 1951).

У маі — чэрвені 1951 г. у складзе дэлегацыі совецкіх пісьменнікаў Пётр Усцінавіч па запрашэнню Саюза пісьменнікаў Чэхаславакіі наведаў Чэхаславакію.

1952 23 верасня 1952 г. XX-м з'ездам Комуністычнай партыі Беларусі Пётр Усцінавіч Броўка выбран у члены Цэнтральнага Камітэта КПБ. [1])

Выдана кніжка - нарыс Петруся Броўкі **«Месяц у Чэхаславакіі»** (Мінск, ДВБ, 1952), у якой паэт апісвае сваё падарожжа па Чэхаславакіі ў 1951 годзе. На румынскай мове выдана кніжка паэта **«Вершы»**.

1953 8 студзеня 1953 г. Пётр Усцінавіч Броўка выбран членам - карэспандэнтам Акадэміі навук БССР. [2])

У серыі «Школьная бібліятэка» выдана паэма Петруся Броўкі **«Кацярына»** (Мінск, Вучэбна-педагагічнае выд-ва БССР, 1953).

1954 На Мінскай VIII абласной партыйнай канферэнцыі Пётр Усцінавіч Броўка выбран дэлегатам на XXI з'езд КП Беларусі. [3])

10 — 13 лютага 1954 г. удзельнічаў у рабоце XXI з'езда КП Беларусі.

13 лютага выбран XXI з'ездам КП Беларусі ў члены ЦК КПБ. [4])

---

[1]) Гл. газ. «Звязда» № 228 за 24/IX-1952 г.
[2]) Гл. газ. «Звязда» № 7 за 9/I-1953 г.
[3]) Гл. газ. «Мінская праўда» № 26 за 5/II-1954 г.
[4]) Гл. газ. «Звязда» № 38 за 14/II-1954 г.

«Зямля Беларусі! Табой мы сагрэты,
Ніколі не сходзіш ты з нашых вачэй».

*Пятрусь Броўка* [1])

## КНІГІ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ

**1. Выбраныя творы.** Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, 1951, 671 стар., 10 000 экз., 22 руб.

Вершы і паэмы Петруся Броўкі аб'еднаны ў кнізе ў два храналагічныя раздзелы: 1926 — 1940 гг. і 1941 — 1951 гг.

У кнігу ўвайшлі наступныя паэмы: «Праз горы і стэп» (1932), «Кацярына» (1937 — 1938), «Паэма пра Смалячкова» (1942), «Беларусь» (1943), «Ясны кут» (1944), «Паланянка» (1945), «Думы пра Маскву» (1946), «Хлеб» (1946), «Бацькаў дом» (1947), «Родныя берагі» (1948), «Добры друг» (1949) і «Чырвон-гарадок» (1950).

Уступны артыкул аб творчасці Петруся Броўкі напісан **Ул. Агіевічам.**

**2. Сонечнымі днямі** (Вершы і паэмы). Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, 1950., 170 стар., 4 000 экз., 6 руб. 80 кап.

У кнізе змешчаны вершы Петруся Броўкі 1947 — 1949 гг. і паэмы: «Бацькаў дом» (1947), «Родныя берагі» (1948) і «Добры друг» (1949).

**3. Выбраныя вершы і паэмы.** Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, рэд. вучэбна-педагагічнай літаратуры, 1948., 224 стар.

---

[1]) П. Броўка. Выбраныя творы. Мінск, ДВБ, 1951, стар. 359.

(Б-ка школьніка). 30 000 экз., 4 руб. 70 кап., пераплёт 50 кап.

У зборніку змешчаны выбраныя вершы 1935 — 1946 гг. і паэмы: «Праз горы і стэп» (1932), «Кацярына» (1937 — 1938), «Паэма пра Смалячкова» (1942), «Беларусь» (1943), «Ясны кут» (1944), «Думы пра Маскву» (1946) і «Хлеб» (1946).

4. **Выбраныя творы.** Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, 1947, 451 стар. (Выбраныя творы беларускай савецкай літаратуры. 1917 — 1947). 8 000 экз., 12 руб., пераплёт 50 кап.

Кніга выдана да 30-годдзя Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай рэволюцыі.

Вершы і паэмы Петруся Броўкі змешчаны ў храналагічных раздзелах: 1926 — 1932; 1933 — 1940; 1941 — 1946. З паэм у адпаведныя храналагічныя раздзелы кнігі ўвайшлі: «Праз горы і стэп» (1932), «Кацярына» (1937 — 1938), «Беларусь» (1943), «Ясны кут» (1944) і «Хлеб» (1946).

Уводны артыкул «Паэтычная творчасць Петруся Броўкі» напісан **С. Майхровічам.**

У канцы прыложана бібліяграфія кніг Петруся Броўкі, выданых з 1930 па 1947 гг. і спіс крытычных артыкулаў аб творчасці паэта.

5. **Вершы і паэмы.** Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, рэд. дзіцячай літаратуры, 1946., 176 стр. (Школьная б-ка)., 20 000 экз., 4 руб.

У кнізе змешчаны выбраныя вершы 1935 — 1943 гг. і паэмы «Праз горы і стэп» (1932), «Паэма пра Смалячкова» (1942), «Беларусь» (1943) і «Ясны кут» (1944).

Уступны артыкул аб жыцці і літаратурнай дзейнасці Петруся Броўкі напісан **І. Жыдовічам.**

6. **Выбраныя творы.** Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, 1945., 188 стар., 8 000 экз., 20 руб.

Кніга змяшчае ў сабе 19 выбраных вершаў 1935 — 1943 гг. і паэмы: «Кацярына» (1937 — 1938), «Беларусь» (1943), «Ясны кут» (1944), «Праз горы і стэп» (1932) і «Паэма пра Смалячкова» (1942).

**7. Кацярына.** Паэма. Вокладка і малюнкі мастака **Ю. Пучынскага.** Мінск, Дзярж. вучэбна-педагагічнае выдавецтва БССР, 1953, 86 стар. (Школьная б-ка), 15 000 экз., 2 руб. 70 кап.

**8. Месяц у Чэхаславакіі.** (Нарыс). Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, 1952., 67 стар., 10 000 экз., 90 кап.

«Кожнай думкай, справаю сваёю
Я супроць падпальшчыкаў вайны»

*Пятрусь Броўка* [1])

# ТВОРЫ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ Ў ПЕРАКЛАДЗЕ НА РУСКУЮ МОВУ

1. **Дорога жизни.** Стихи. Авториз. перевод с белорусского Дмитрия Осина. Минск, Гос. изд-во БССР, 1950, 155 стр., 8 000 экз., 5 руб. 50 коп. в переплёте.

2. **Дорога жизни.** Стихи. Авториз. перевод с белорусского. М., «Правда», 1952., 28 стр. (Б-чка «Огонёк» № 47), 150 000 экз., 40 коп.

3. **Избранное.** Авториз. перевод с белорусского. Под ред. **С. Б. Иринина**. М., Гослитиздат, 1949., 272 стр., 20 000 экз., 10 руб.

Найбольш поўнае выданне твораў Петруся Броўкі на рускай мове. У ім змешчаны вершы паэта 1928 — 1948 гг. і паэмы: «Через горы и степь» (1932), «Катерина» (1937 — 1938), «Белорусь» (1943), «Ясный кут» (1944), «Хлеб» (1946), «Поэма о Смолячкове» (1942), «Отчий дом» (1947), «Родные берега» (1948).

У канцы кнігі прыложана біяграфічная даведка.

4. **Стихи и поэмы.** Перевод с белорусского. М., «Советский писатель», 1948., 215 стр., (Б-ка избранных произведений советской литературы. 1917 — 1947), 8 руб. 50 коп.

Выбраныя творы 1934 — 1947 гг. У раздзеле паэм змешчаны: «Катерина» (1937 — 1938), «Белорусь» (1943), «Ясный кут» (1944). «Прощальное слово» (1946), «Хлеб» (1946), «Думы о Москве» (1946).

У канцы змешчана кароткая біяграфічная даведка.

---

[1]) П. Броўка. Выбраныя творы. Мінск, ДВБ, 1951, стар. 609.

## ЛІТАРАТУРА АБ ЖЫЦЦІ І ТВОРЧАСЦІ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ

**Перкін Н.** Творчасць Петруся Броўкі (Крытычны нарыс). Мінск, выд-ва Акадэміі навук БССР, 1952., 143 стар. (Акадэмія навук БССР. Ін-т літаратуры і мастацтва).

* * *

**Бровка Петрусь** (Пётр Устинович Бровка).

В кн. «Большая советская энциклопедия». Изд. 2-е, 1951 г., т. 6, стр. 123.

**Глебка П.** Паэт барацьбіт. Часопіс «Беларусь», 1951, № 12, стар. 10.

**Молдавский Дм.** Дорога в будущее. («Дорога жизни» П. Бровки).

В кн.: «Выдающиеся произведения советской литературы 1950 года». Сборник статей. М., «Советский писатель», 1952, стр. 398 — 407.

**Кучар А.** Пятрусь Броўка.

У кн. **А. Кучар.** Літаратурна-крытычныя артыкулы. Мінск, ДВБ, 1953, стар. 328 — 387.

**Агіевіч Ул.** П. У. Броўка.

У кн. **Броўка П.** Выбраныя творы. Мінск, 1951, стар. 3—18.

**Майхровіч С.** Паэтычная творчасць Петруся Броўкі.

У кн. **П. Броўка.** Выбраныя творы. Мінск, 1947. (Выбраныя творы бел. сов. літаратуры 1917 — 1947), стар. 5 — 29.

## ЗМЕСТ

Пастановы Совета Міністраў СССР 1947 г. і 1951 г. «Аб прысуджэнні Сталінскіх прэмій за выдатныя работы ў галіне навукі, вынаходства, літаратуры і мастацтва». (Вытрымка) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5

Асноўныя даты жыцця і творчасці П. Броўкі . . . . . . . 8

Кнігі Петруся Броўкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 15

Творы Петруся Броўкі ў перакладзе на рускую мову . . . . 18

Літаратура аб жыцці і творчасці Петруся Броўкі . . . . . 19

1964

Цана 25 кап.

B0000002587 17 1